Літаратура і мастацтва

05.03.2019

# Евангелле з Лаўрышава зноў на Радзіме

**Усё часцей і часцей мы чуем, чытаем, бачым навіны пра вяртанне на Беларусь каштоўнасцяў, праз розныя прычыны страчаных, вывезеных, забытых. І хоць часам гаворка ідзе не пра непасрэднае вяртанне арыгіналаў, а пра магчымасць сучаснікаў вывучаць, знаёміцца з гістарычнымі, культурнымі, кніжнымі і рэлігійнымі помнікамі праз іх электронныя ці факсімільныя ўзнаўленні, такія весткі не могуць не выклікаць радасць.**



Вось — новая падзея. У Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адбылася прэзентацыя і ўрачыстая перадача ў дар факсімільнага выдання ўнікальнага для кніжнай культуры нашай краіны рукапіснага Лаўрышаўскага Евангелля. Уся грандыёзная і высакародная задумка ўвасобілася ў жыццё дзякуючы супрацы Нацыянальнай бібліятэкі, Пасольства Украіны ў Беларусі, выдавецтва «Горобець».

Гэтая ўнікальная кніга датуецца XIII—XIV ст., яна была створана для праваслаўнага Лаўрышаўскага мужчынскага манастыра пад Наваградкам (пра гэта сведчаць дарчыя запісы). У XIX ст. Евангелле было вывезена ў Кракаў, дзе і сёння захоўваецца ў Бібліятэцы князёў Чартарыйскіх.

Каштоўнасць кнігі — не толькі ў гісторыі і тэксце, але і ў аздабленні. Лаўрышаўскае Евангелле ілюстравана мініяцюрамі, пераплёт упрыгожаны каштоўнымі камянямі і

фігурнай металічнай пласцінай з выявай святога воіна (магчыма, такім чынам нашы продкі захавалі памяць пра князя Войшалка).